У. ГАЛУБОК

СУД

П'еса ў 1-ым акце

БЕЛАСТОК

Выдавецтва
ГАЛОЎНАГА ПРАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА
ГРАМАДСКА—КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА
ў Польшчы

У. ГАЛУБОК

СУД

П'еса ў 1-ым акце

БЕЛАСТОК

Выдавецтва
ГАЛОЎНАГА ПРАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА
ГРАМАДСКА—КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА
ў Польшчы

Nakład 3.000 egz. Ark. druk. 1. Papier druk. sat. 7 kl 60 gr. A-1
Manuskr. otrzym. 22.III.58 podpis. do druku 9.IX.58 druk ukończ.
15.X.58. Białostockie Zakł. Graf. Białystok, Malmeda 1. Zam. 929.
E-1

У. ГАЛУБОК.

С у д

П'еса ў 1-ым акце.

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

СТОРАЖ — 65 год.
ГАРБУЗ, селянін — 50 год.
ГАРБУЗІХА МАГЖАТА, яго жонка—45—50 год.
ЛАУРЭН АВЕЧКА, кульгавы сведка — 50 год.
ПІСАР — 35 год.
СТАРШЫНЯ — 40 год.
СУДДЗЯ — 50 год.
УПРАУЛЯЮЧЫ — 40 год.

З'ЯВА І-ая

(Уваходзіць стораж, трымаючы венік у руках).

СТОРАЖ *(здзіўлены)*. Ах, каб на вас чума, стольскі смецця за адзін вечар нарабілі, адных коркаў ды акуркаў повен кут назмятаў. Ну і людзі, апундырыліся гарэлкай, *(мятучы)*, смакталі гэту няшчасніцу да таго, што і памяць страцілі. Пісар да таго дапіўся, што мяне, старога чалавека, за бабу палічыў і цалаваць пачаў, абзываючы нейкай Забэлькай, во каб яго свінні цалавалі, намысліўся; а

старшыня і ваўком выў, і сабакам брахаў, і плаваў па падлозе; адзін фэльчар маладзец, той калі пачуў, што ногі адняліся, падазваў мяне і папрасіў, каб занёс у пуню на салому, а мне што кажуць — слухаю, ужджабурыў, як ягнё, на плечы і завалок па адрасу. І як у іх галовы на карках трымаюцца: сягоння суд, а яны, як мухаморы, п'яныя. Пісар ад гарэлкі азыск, галава, як цёрліца, вочы акурталіся, а рукі, як машына, маланкаю паперы скрыгаюць — шась, шась! я з венікам так не спраўлюся.

З'ЯВА II

(Увaходзіць Гарбуз)

ГАРБУЗ. Добрага дня.

СТОРАЖ *(спужаўшыся)*. А ліханька тваім кастылём, спужаў мяне, хто ты і адкуль ты?

ГАРБУЗ. Я — Дзяніс Гарбуз, з Негнавіч.

СТОРАЖ. На якое ліха тут?

ГАРБУЗ. А хіба-ж запомнілі? паперай клікалі на суд.

СТОРАЖ. Адкуль мне ведаць, я цябе не клікаў і паперы не пісаў.

ГАРБУЗ. А хто-ж вы?

СТОРАЖ. Хіба-ж не ведаеш, як прозвішча таго, што піша венікам па падлозе?

ГАРБУЗ. Ведаю.

СТОРАЖ. Пашто-ж пытаешся?

ГАРБУЗ. Хто пытаецца, той не блудзіць.

СТОРАЖ. Дык чаго ты прыехаў з-за свету сюды?

ГАРБУЗ. Ды не прыехаў, а прышоў. Каня ваўкі аблажылі, а пасля кароста з'ела. На суд значыцца.

СТОРАЖ. *(прыглядаецца)*. Што гэта ў цябе: барада — не барада, касмыль — не касмыль?

ГАРБУЗ. Была барада, і досыць рослая, але як палову выдралі, касмыль застаўся.

СТОРАЖ. У каго гэта рукі свярбелі рваць яе?

ГАРБУЗ. У аконама князеўскага, вось за гэта-ж і суд.

СТОРАЖ. Ліха-ж яму дало рваць чалавеку бараду.

ГАРБУЗ. Выдраў, каб з яго вантробы выдралі.

СТОРАЖ. А ў цябе-ж хіба адвагі не было па руцэ ўгрэць таму аконаму?

ГАРБУЗ. Калі я чалавек без адвагі, я ніколі нікога не біў, а мяне білі.

СТОРАЖ. У войску служыў?

ГАРБУЗ. Я — белабілетнік, нікуды нягожы.

З'ЯВА III

(Увaходзіць Гарбузіха)

ГАРБУЗ. Вось мая баба, Гарбузіха Магжата.

ЖОНКА. Добрага дня, не ведаю, хто будзеце — ці не старшыня воласці?

СТОРАЖ. Але-ж, старшыня над гэтым дзеркачом.

ЖОНКА. Тым лепш, прынамсі адкажаце, калі запытаемся.

СТОРАЖ. А чаму-ж, пытайцеся?

ГАРБУЗ. Будзьце ласкавы, браток...

ЖОНКА. Чакай, я пачну. Ці невядома вам, як

суд паглядзіць на гэтую знявагу, бачылі бараду?

СТОРАЖ. Бачыў.

ГАРБУЗ. Бачыць мала, трэба ведаць, які боль.

ЖОНКА. Стой, не адзывайся, не дзіця — усё ведае.

СТОРАЖ. Калі-б былі сведкі...

ГАРБУЗ. А то як-жа, былі.

ЖОНКА. Стой, не адзывайся, сведка ёсць, сусед Авечка кульгавы.

ГАРБУЗ. Але-ж, ён кульгавы, трохі пройдзе, дый сядзе, трохі пройдзе, дый сядзе.

СТОРАЖ. Ды гэта да справы не адносіцца.

ГАРБУЗ. У судзе ўсё разгледзяць, што адносіцца і што не адносіцца.

СТОРАЖ. О, яны разгледзяць, толькі моцна на нагах трымайцеся.

ЖОНКА. Мала барады, дык яшчэ гуплікаў надаваў і тры зубы выбіў.

ГАРБУЗ. Што ў мяне бакі дубовыя?

СТОРАЖ. Я не суддзя, але наперад кажу, што з багатым не варта судзіцца, а з дужым біцца.

ЖОНКА. Мы яго засудзім, наша крыўда відочная.

СТОРАЖ. Пакуль сыты пахудзее, дык худы памрэ!

ЖОНКА. Хіба-ж у судзе дзверы не роўна адчыняюцца для ўсіх?

СТОРАЖ. Пабачыце, тады скажаце.

ГАРБУЗ. То як-жа будзе?

СТОРАЖ. Так і будзе, даў — насі на здароўе.

ЖОНКА. Хіба-ж на яго суду няма?

СТОРАЖ. Ёсць. Пісар храпе там, старшыня ў хляве на саломе, а суддзя тут; абы ачнуліся, калі шухнуць — уздзівішся.

ГАРБУЗ. Працавітыя людзі.

СТОРАЖ. Так, працавітыя. Ну, вы тутака пасядзеце, а я пайду вадзіцы прынясу, ачнуцца — запатрабуюць. *(Бярэ вядро і выходзіць)*.

ЖОНКА. А мы тымчасам закусім трохі. *(Села на лаву)*. Ну, давай сюды торбу, нешта пад грудзямі смокча.

ГАРБУЗ *(шукае ў торбе)*.

ЖОНКА. Ну, чаго-ж сапеш, як кавалёў мех, даставай бараніну.

ГАРБУЗ. Нешта не знайсці яе.

ЖОНКА. Хіба ты запомніў узяць яе?

ГАРБУЗ. Яно так і будзе: адыходзячы, паклаў на стале і запомніў.

ЖОНКА. А, раззява, ліханька тваім баком, як рвану цябе за гэты касмыль!

ГАРБУЗ. Чакай, чакай, баба.

ЖОНКА. Выправіўся дурналяп з пустой торбай.

ГАРБУЗ. Не так ужо і пустая, хлеб і сала ёсць. *(Дае хлеб)*.

ЖОНКА. Давай! *(Адламала маленькі кавалачак, аддала Гарбузу і пачынае есці)*.

О! старое карыта...

ГАРБУЗ. Ну, годзе ўжо лаяцца, а то папярхнешся сухім хлебам.

ЖОНКА *(пачала душыцца)*.

ГАРБУЗ. А што, я табе казаў... не плявузгай. *(Стукае кулаком у карак)*.

ЖОНКА. Маўчы, дурналяп.

ГАРБУЗ *(стукаючы ў карак)*. Ты лепш маўчы, а

то горш будзе. Во дзе розум у бабы: трэба-ж, напхала ў мяліцу гэталькі хлеба. Ну, глытай, глытай. *(Пауза)*. Нарэшце — паехаў...

ЖОНКА. У... заледзьве не задушылася.

ГАРБУЗ. Напужала толькі, а мне, ліха ведае, што здалося.

ЖОНКА. Няхай табе не здаецца, не памру. *(Есць)*.

ГАРБУЗ. Ізноў кладзеш цэлы акраец, ці пры памяці ты, баба?

ЖОНКА. Не ў госці прышлі, трактаваць не будуць.

ГАРБУЗ. А што, каб Авечку клікнуць — няхай бы і ён укусіў трохі, таксама здарожыўся, знябыткаваўся.

ЖОНКА. Не трэба, нажарэцца, а пасля не сойдзецца. *(Есць)*.

ГАРБУЗ. Як хочаш, зноў кажу табе — не спяшайся, баба, і не кладзі такіх вялікіх кавалкаў, што цябе ў горб б'юць!

ЖОНКА. Я не ў гасцёх, ем свой хлеб.

З'ЯВА IV

(Уваходзіць з бакоўкі пісар, галава ў пуху.)

ПІСАР *(пацягваецца)*. I сам згадаць не магу, ці гэта раніца, ці вечар, — нічога не кемлю. Сонца за бярозамі не відаць, галава — як палена. Напіўся ўчора на імянінах, як свіння... *(Дастаў гадзіннік)*. Ды што гэта з ім? памёр, пахілены, хто-ж гэта яго пахіляў? Ну, тут нічога не даб'юся, ну, а чэрап мой цэлы? *(Глядзіць у люстра)*. А бацюхны мае, няўжо гэта я? адна страхата, вось дзе кветка лугавая, каб цяпер шмарганул цэглай па гэтым гарбузу.

ГАРБУЗ і ЖОНКА. Паночку, Гарбузы ўжо тут.

ПІСАР *(спужаўшыся)*. Хто вы такія, якая мара ўнесла сюды?

ГАРБУЗ. Мы, паночку, Гарбузы: я — Дзяніс, а яна — Магжата.

ЖОНКА. Пашаноту пану перш. *(Кланяецца ў пояс)*.

ГАРБУЗ. Добрага здаровейка.

ПІСАР. Вы чаго тут?

ГАРБУЗ. Гэта мы, паночку...

ЖОНКА. Стой, не адзывайся. Мы, паночку, па загадзе вашым прыйшлі. *(Да мужа)*. Дзе абвестка?

ГАРБУЗ. Няма абвесткі, скурылі з Авечкай.

ЖОНКА. Скурылі?! Ах, каб твая шэрсць курэла, бараніну запомніў, абвестку скурыў: мы, паночку на суд прышлі.

ПІСАР. На які суд?

ЖОНКА. Толькі сонейка ўзышло, мы ўжо былі тутака, панок за сцяной смачна спалі, бо храплі, не раўнаючы, як басэтля.

ПІСАР. Зноў пытаюся, на які суд?

ГАРБУЗ. Мне, паночку вылупілі бараду.

ЖОНКА. I тры зубы выбілі.

ПІСАР. Хто вырваў бараду, пытаюся?

ГАРБУЗ. Аконам князёўскі.

ЖОНКА. Але-ж ён, аконам.

ПІСАР. Ага, памятаю, гэта справа на чарзе, вылазьце за дзверы, рассудзіма як след. *(Пауза)*.

Ну, чаго-ж лыпаеце вачыма, бач іх — расселіся, паветра псуць, курылі тут?

ГАРБУЗ. Ніхто не курыў, хлеб елі ды баба папярхнулася.

ЖОНКА. Так, паночку, папярхнулася.

ПІСАР. Ну, вылазьце — паклічу. *(Гарбузы пашлі)*. Значыць сягоння суд, во каб цябе распеpазала, заледзьве не праспаў. *(Разглядае на стале справы)* Дело управляющего й эконома с крестьянином Гарбузом. Эконом и управляющий обвиняются, а Гарбуз потерпевший. *(Пауза)*. Справа досыць паважная, толькі п'янай галаве і разбіраць яе *(Пауза)*. Ліха ведае, да чаго я дайшоў, адна страхата. Старшыня не праспаўся, суддзі таксама. Мірон, а Мірон! *(Пауза)*. Не йдзе, ён пасля гэтакіх папоек недаступны. Мірон, а Мірон, дзе ты, а то ў адседку пасаджу.

З'ЯВА V

(Уваходзіць з 2-ма вёдрамі сторож Мірон).

ПІСАР. Вось добра, Міронка, што ты тут, а яшчэ лепш, што вады прыпёр. Сцюдзёная?

СТОРАЖ. Хіба-ж не цяпер ведаю, што пасля такіх папоек вада з крыніцы патрэбна.

ПІСАР. Ты, Мірон — залаты чалавек, усё ведаеш, што начальству патрэбна, за гэта прадстаўлю цябе к наградзе.

СТОРАЖ. Так, к наградзе.

ПІСАР. Прадстаўлю к наградзе і напішу: Мірону, залатому чалавеку, дайце залаты мэдаль.

СТОРАЖ. Пакуль той мэдаль дадуць, на паўбутэлькі зараз скажаце даць, ведаю я вас.

ПІСАР. Начальства запытаецца, хто такі Мірон? А я напішу: Мірон — сторож, Мірон — бацька, служыць не за страх, а за сумленне, разумееш, Мірон, што гэта за словы?

МІРОН. Разумець я іх не разумею, але напамяць ведаю, штодзень гаворыце, як пахмяліцца трэба, а як ужо пахмяліліся, тады кажаце: Мірон, вылазь вон.

ПІСАР. Эх, Мірон, Мірон, утраціў ты веру, не хочаш мэдалю.

СТОРАЖ. Чаму не хацеў-бы, але яго няма. Калі ён будзе?

ПІСАР. Будзе, Мірон, будзе. Ты ўяві сабе, Мірон, як ты будзеш выглядаць, калі на тваіх грудзёх заблішчыць залаты мэдаль з царскім патрэтам. Едзеш ты праз вёску—табе без грошай чарку наліваюць, прыйшоў ты ў суд — цябе садзяць за чырвоны стол, а прыехаў ты ў горад — не кажу, што прышоў, а прыехаў: хто з мэдалямі, пехатой не ходзіць, — табе ў горадзе гарадавы аддае чэсць, дворнік не мяце вуліцы, каб не закурыць твайго мэдалю, афіцэры на цябе глядзяць, салдаты цішком перашэптваюцца, — во, кажуць, заслужоны чалавек паўзе.

СТОРАЖ. Ну, годзе, панок, падстаўляйце галаву, палью трохі ды прычашэцеся трохі, а то галава на макотру выглядае.

ПІСАР *(у люстра)*. Праўду кажаш, Мірон, гэта галава не пісара.

СТОРАЖ. *(на бок)*. А канакрада нейкага.

ПІСАР. А скажы мне, Мірон, чаму мой гадзіннік не ідзе?

СТОРАЖ. А як ён можа йсці, калі пан яго аб сцяну так гакнулі, аж толькі падрабязгі пасыпаліся.

ПІСАР. Аб сцяну? з якой прычыны?

СТОРАЖ. А з якой прычыны мяне за бабу палічылі, цалавалі, Забэлькай абзывалі, цьфу...

ПІСАР. Нічога не памятаю.

СТОРАЖ. Так п'ючы, і памятаваць ніхто не зможа. Гляньце, да чаго выглядае канцылярыя, усё гарэлкай пазалівалі, ледзьве да парадку давёў.

ПІСАР. Каторая цяпер гадзіна?

СТОРАЖ. Паўдня.

ПІСАР. Ліха ведае што, так позна абудзіўся, а тут суд такі паважны, сам упраўляючы павінен быць.

СТОРАЖ. Безбароды ўжо тут.

ПІСАР. Гэта, што... Ну, будзь ласкаў, палівай.

СТОРАЖ. Лью.

ПІСАР. Толькі асцярожна, за карак не залі.

СТОРАЖ. Не першыня. *(Лье ваду).*

ПІСАР. А... а... як добра.

СТОРАЖ. Годзе.

ПІСАР. Дзякую табе, Мірон, ты мяне вылечыў.

СТОРАЖ. Ручнік даць?

ПІСАР. Ручніка не трэба, з мокрай галавы хутчэй жар выйдзе, гэтак кажа разумны чалавек, прафесар Кнэйп. Ты чуў што аб тым Кнэйпе?

СТОРАЖ. Нічога я не чуў, але без прафесара ведаю, што карысней ліць ваду на галаву, як гарэлку ў галаву.

ПІСАР. Ты, Мірон, разумны чалавек, табе трэба ў гасударственным савеце сядзець, а не тут.

СТОРАЖ. Зноў пачынаеце хваліць, і зараз скажаце прынесці пахмяліцца.

ПІСАР. Залаты чалавек, залаты, наперад ведае патрэбу маю.

СТОРАЖ. На ліха вам патрэба, прачухаліся — і добра.

ПІСАР. Зразумей-жа ты, Мірон, што чарку не вып'ю — галава, як палена, канцылярыя — сірата, ты без службы, сяляне без пашпартоў, воласці няма, ну, а па-другое — сягоння суд, упраўляючы сам будзе. Ну, будзь ласкаў, Мірон, схадзі прынясі паўпляшкі, ды па дарозе раскурстай старшыню.

СТОРАЖ. Дайце-ж грошы!

ПІСАР. Зноў камедыя. Купі, Міронка, за свае, я прашастаўся ў карты, разлічымся.

СТОРАЖ. Калі гэта будзе? я са шчоту збіўся.

ПІСАР. Я памятаю. Ну, плыві, Мірон, плыві.

СТОРАЖ. Ах, пакіньце так казаць, я не рыба, не плыву.

ПІСАР. Ну, дык пяшэчкам.

СТОРАЖ. Гэта апошняя паўбутэлька на доўг. *(Пайшоў).*

ПІСАР. Вось да чаго дайшоў. Я, пісар, грошы ў стаража пазычаю. Дзела № 447, праклятае дзела *(панюхаў)*, і яно гарэлкай смярдзіць; ну, а хто тут ёсць, хто сведкі, ці ўсе паперы? Сведка нейкі Лаўрэн Авечка, пэўна — дурань, калі авечка. Ну, а ўрачэбнае свідзецельства ёсць... што бараду выдралі і тры зубы выбілі. *(Шукае).* Няма, ну, та-

ды Гарбуз пакоціцца назад, я магу сказаць, што мяне соннага пацук за нос укусіў, — хто гэтаму паверыць? А ну, глянуць, які ў іх авечка. *(Сеў на стол).* Ці авечка тут ёсць? *(За сцэнай* — «Тут панок!») Паўзі сюды!

З'ЯВА VI

(Уваходзіць сведка Авечка).

ПІСАР. Ты Авечка?

АВЕЧКА. Так точна, я Лаўрэн Авечка.

ПІСАР. Прайдзіся па канцыляры.

АВЕЧКА. Прайсціся?

ПІСАР. Прайдзіся.

АВЕЧКА. А закурыць дасцё?

ПІСАР. *(грозна).* Прайдзіся па канцыляры!

АВЕЧКА *(ідзе).*

ПІСАР. Кульгаеш трохі?

АВЕЧКА. Не трохі, а такі й добра кульгаю, яна ў мяне сухая, як таран, і караней на цалі дзве. *(Пауза).* А хто, пан, будзеце, ці не доктар?

ПІСАР. Я — пісар.

АВЕЧКА. Пісар? А, добрага здаровейка! *(Працягнуў руку).*

ПІСАР. *(Штурхануў Авечку нагой).* Цяпер ведаеш, хто я?

АВЕЧКА. Ведаю.

ПІСАР. Так ідзі туды, і чакай, паклічу.

АВЕЧКА. Зноў туды? Калі там нудна, Гарбуз накурыў, хоць ты сякеру павесь. *(Пауза).* А можа ў пана закурыць ёсць, — нешта тут смокча.

ПІСАР. Я не куру.

АВЕЧКА. Дзіўна, каб начальства не курыла, а гарэлку пэўна-ж п'яцё?

ПІСАР *(Грозна стукнуў па стале).* Што ты мяне спавядаеш? Вон!

АВЕЧКА. Іду, паночку, іду. *(Уцёк).*

ПІСАР. Ну й Авечка, ха, ха, ха... Ну, а хто там у бакоўцы храпе? А, паважны суддзя! *(Пайшоў у бакоўку).*

З'ЯВА VII

(Уваходзіць старшыня з галоўных дзвярэй, галава ў саломе).

СТАРШЫНЯ. Вось да чаго дажыўся старшыня, спаў недзе ў хляве,цьфу, які сорам! Добра, што апроч парсюка ніхто не бачыў. І як гэта я трапіў туды, хоць рэж, не ўспомню, усё гарэлка вінна, хатнюю добрую пасцель змяніў на свінячую падсцілку. Пісар, звадыяш, напаіў, як шаўца.

З'ЯВА VIII

(Выходзіць з бакоўкі Пісар).

ПІСАР. А, каго бачу? як спалася?

СТАРШЫНЯ. Дзе спаў і як спаў — не памятаю, ведаю толькі, што было шмат вольнага і цёплага паветра.

ПІСАР. Ведаем, як для начальства, усе выгады, а я спачываў тут. Галава, як човен, Мірон паліваў ужо.

СТАРШЫНЯ. Кажаш, паліваў?

ПІСАР. А то як-жа іначай? назначылі суд, а тут мы во...

СТАРШЫНЯ. Дай сюды люстра.

ПІСАР. На, толькі не спалохайся.

СТАРШЫНЯ. Няўжо гэта я, няўжо старшыня?
ПІСАР. Хіба-ж ён.
СТАРШЫНЯ. Малпа — не малпа, мядзведзь — не мядзведзь, сябе не пазнаю. Вада ёсць?
ПІСАР. Ёсць.
СТАРШЫНЯ. Будзь ласкаў, узлі на мой чэрап.
ПІСАР. З вялікай ахвотай, прыказка нездарма кажа — п'яніца п'яніцы спагадае. *(Нагнуў).*
СТАРШЫНЯ. А... як добра, як добра.
ПІСАР. Прафесар Кнэйп гэтым толькі і лечыць людзей.
СТАРШЫНЯ. Лечыць, апроч п'яніц.
ПІСАР. За гэта не бяруся, браў пад увагу п'яніц, ці не. Уся.
СТАРШЫНЯ. Адразу пасвятлела, цяпер я і цябе бачу, і свет бачу. Дай ручнік.
ПІСАР. Кнэйп кажа не выцірацца.
СТАРШЫНЯ. Няхай будзе і так. Дзе Мірон?
ПІСАР. Я паслаў.
СТАРШЫНЯ. Хіба я здагадваюся?
ПІСАР. А то як-жа іначай? трэба.
СТАРШЫНЯ. За гэта і пашанота табе, што адчуваеш тое, што і я.
ПІСАР. Не так адчуваю я, як адчувае Мірон, казаў, што крэдыт мне зачыніць.

З'ЯВА IX

(Уваходзіць Мірон з бутэлькай у руках).

ПІСАР. Ну, Мірон, прынёс збавенне?
СТОРАЖ. Прынёс. *(Дае).*
ПІСАР. Давай шклянкі.

СТОРАЖ. Як іх даваць, калі ўчора ўсе патаўклі?
ПІСАР. Няма — не трэба. *(Стукнуў аб далонь і абліў Мірона).*
СТОРАЖ. Паночку, не кідайце коркаў на падлогу, толькі што вымеў цэлы воз.
СТАРШЫНЯ *(грозна).* Ты хіба не ведаеш сваіх абавязкаў?
СТОРАЖ. Як-то не ведаю: прыносіць за свае грошы гарэлку, зносіць лаянку і цягнуць п'яных па ўсіх хлявох — ведаю.
СТАРШЫНЯ *(убок).* Вось цяпер я зразумеў, чаму я спаў разам з парсюком у хляве.
ПІСАР. Ну, Мірон, вылазь вон, а то будзе бура.
СТАРШЫНЯ. Ад слова, а то нават заначуеш у халодніцы.
СТОРАЖ. Я-ж кажу, як на паўбутэлькі даць, тады — братачка Мірон, сватачка Мірон, мэдальку Мірону, а як даў, — тады скулу яму, Мірон вылазь вон. Апошняя паўбутэлька на доўг. *(Пайшоў).*
СТАРШЫНЯ. Я яго жывога з'ем.
ПІСАР. За што?...
СТАРШЫНЯ. Я ведаю, за што.
ПІСАР. Ну, годзе злаваць, абудзім лепш суддзю.
СТАРШЫНЯ. А хіба-ж ён тут?
ПІСАР. Тут спіць. *(Пайшоў у бакоўку).*
СТАРШЫНЯ. Гэта-ж знявага, суддзі спяць тут, а старшыня ў хляве, хіба я не буду старшынёй, а Мірону падзякую. Ліха ведае, што, гэта-ж калі дазнаюцца людзі — асмяюць. Старшыня ў кампа-

ніі з парсюком... А які-ж прыемны бачыў сон: быццам мы з кумам Гаўрылам так доўга не бачыліся і, нарэшце, спаткаліся, на радасцях добра выпілі і, абняўшыся, праспалі ўсю ноч. І трэба-ж — так дастасавалася, ніякага кума і блізка не было, а замест кума — парсюк пудоў з дзесяць.

З'ЯВА X

(Выходзяць з бакоўкі Пісар і Суддзя).

ПІСАР. Ну, бычок божы, вылазь на свет, а то і суд праспіш.

СУДДЗЯ. І якія гэта дурні вызначаюць пасля імянін суды?

ПІСАР. Пытаешся, якія дурні, — вось яны, дзівіся!

СУДДЗЯ. Павар'яцелі.

СТАРШЫНЯ. Ну, годзе, пастарайся лахманы прысусліць, а то на ваўка падобны.

СУДДЗЯ. Каб, здаецца, чарку гарэлкі — у ногі пакланіўся-б.

ПІСАР. Ну, так і быць, кланяйся. *(Паказвае гарэлку).*

СУДДЗЯ. А, браток ты мой, ратуй...

ПІСАР. Чакай, чакай, па начальству. Ну старшыня, пачынай.

СТАРШЫНЯ. Каб не суд — не піў-бы, а так мушу. *(П'е, а затым перадае ў рукі суддзі і пісару).*

ПІСАР. *(П'ючы).* Каб за год дождаць і заўжды з парсюкамі спаць.

СТАРШЫНЯ. Смяецца, гад.

З'ЯВА XI

(Уваходзяць: Авечка, Гарбуз і жонка)

АВЕЧКА. На здаровейка, панок.

СТАРШЫНЯ. Хто вас клікаў?

ПІСАР. Вы чаго ўпаўзлі сюды?

ГАРБУЗ. Паны на суд клікалі.

АВЕЧКА. Так, точна, на суд і я прыкульгаў.

ЖОНКА. Паперу прыслалі, але гэтыя салапякі скурылі.

АВЕЧКА. Так точна, скурылі, і я памагаў.

СТАРШЫНЯ. *(да пісара).* Хто яны?

ПІСАР. *(Штосьць шэпча на вуха старшыні).*

СТАРШЫНЯ. А! гэта тыя мяцежнікі, што ўпраўляючага абразілі?

ГАРБУЗ. Гляньце, паночку, на бараду — то ўбачыце абразу.

СТАРШЫНЯ. І глядзець не хачу, дай сюды абвестку.

ГАРБУЗ. Я-ж пану пісару прызнаўся, што скурылі з Авечкай.

АВЕЧКА. Так точна, скурылі, і я памагаў.

ЖОНКА. Я ўжо лаяла іх за гэта, а, прыйшоўшы дахаты, і штурханцоў надаю.

СТАРШЫНЯ. Гэта-ж знявага.

АВЕЧКА. Так точна, знявага, скурылі абвестку, але ў нас звычай такі: усё што пад рукі пападаецца папяровае, курыць — ксёнжку, газету, абвестку, ведама, народ цёмны, чытаць не ўмее, а курыць усё. Я, памятаю, лемантар дзяцінны скурыў, во як...

ГАРБУЗ. Я ўжо адумаўся, але па часе.

АВЕЧКА. Так точна, і я адумаўся, але па часе.
СТАРШЫНЯ. Аштрафаваць гада.
ГАРБУЗ. Паночку!
ЖОНКА. Але-ж гэта ён зрабіў не з роскашы.
АВЕЧКА. Так точна, убачылі паперу, як нешта асаблівае, скруцілі па дзве сабачыя ножкі, і толькі.
СТАРШЫНЯ. Я табе скручу ножку.
АВЕЧКА. Хіба ўжо другую, бо адна скручаная. — во, што за штука. *(Ідзе)*.
СУДДЗЯ. Распачынайце дапрос.
ПІСАР. *(Бярэ ў рукі справу)*. Гарбузіха, кажы ўсё, што ведаеш, і памятай, салжэш — сядзеш у вастрог.
АВЕЧКА. Так точна, за гэта вастрог.
ЖОНКА. Скажам усё, як на споведзі.
СТАРШЫНЯ. Пачынай.
ЖОНКА. Было гэта перад нядзелькай, сонца толькі села за лесам, кот Мацей саскочыў з печы, пачаў мыцца, аж чую, пішчыць нешта за хатай. Што за ліха, думаю сабе, ці не парасё дзе ўшчамілася: зірк у вакно, аж бачу, душаць майго Гарбуза.
АВЕЧКА. Так точна, душаць.
ЖОНКА. Я за чапялу і туды.
СТАРШЫНЯ *(да пісара)*. Запішы чапялу. Што далей?
ЖОНКА *(спужаўшыся)*. Дапала, значыць, я туды, і давай выдзіраць Гарбуза.
АВЕЧКА. Так точна, выдзіраць Гарбуза ды з кіпцюроў пана каршуна.
СУДДЗЯ. Чым ты выдзірала? чапялой?

ЖОНКА. Дзе вы бачылі, каб я ад сваёй цені валілася, як чапяла ў мяне вывалілася на дарозе, я, значыць, падбегшы, тузаю Гарбуза да сябе *(тузае Гарбуза)*, а аконам да сябе.
АВЕЧКА *(тузаючы Гарбуза)*. Так точна, да сябе.
ЖОНКА. Я Гарбуза да сябе, а аконам да сябе. *(Тузае)*.
АВЕЧКА. Так точна, да сябе.
ЖОНКА. А пасля, калі рванула... *(Гарбуз паваліўся ў адзін бок, Авечка — у другі. Авечка ляжыць і трымае адну нагу роўна на падлозе, а другую ўгару)*.
ЖОНКА. То вось што ўбачыла. Гарбуз без барады...
ГАРБУЗ *(Падняў Авечку)*.
АВЕЧКА. Так точна, рванула добра.
СТАРШЫНЯ. А што з барадой?
ГАРБУЗ. Вылупілі з карэннямі.
АВЕЧКА. Так точна, ададралі з карэннямі і са скурай.
ЖОНКА. Частку выдраў, а частку пакінуў — расце.
АВЕЧКА. Які гэта рост, адзін жаль.
ГАРБУЗ. На сухі лес гэтакі рост.
СУДДЗЯ. За што вы біліся?
ГАРБУЗ. Я не біўся, мяне білі.
АВЕЧКА. Так, точна, яго калашмацілі.
ГАРБУЗ. За кароўку-перадойку ўсё ліха пайшло. Кароўка мая часта бегала да паноў у двор.
СТАРШЫНЯ. Чаго ёй трэба было там?
ГАРБУЗ. Ці яна скажа? Бегала.

АВЕЧКА. Так точна, бегала, ля майго гумна, нацяньні значыцца. Я, было, раз спрабаваў пераняць, другі — ды дзе там, пшэпрашаёнц, калі чмыхне, калі паставіць хвост дудой, а няхай цябе воўк, бяжы — хоць ты ногі пакруці, шалёную карову і шалёную сабаку не кожны спыніць.

ГАРБУЗ. У панскім дварэ, гэта-ж не ў нас. Узышла жывёліна — штрап: я раз заплаціў, другі.

АВЕЧКА. Так точна, штрапы плаціў.

СТАРШЫНЯ. Па квіткох?

ГАРБУЗ. Па квіткох.

СТАРШЫНЯ. Дай сюды квіткі.

ГАРБУЗ. Няма, паночку, скурылі і квіткі.

АВЕЧКА. Так точна, услед і скурылі, у нас гэтак.

ГАРБУЗ. А пасля махнуў рукой. Трэба-ж, на ліха зноў зачынілі маю перадойку, і кажуць штрап заплаціць, «А скулу не хочаш?» — гакнуў я...

СУДДЗЯ. Так і сказаў?

ГАРБУЗ. Так і сказаў.

АВЕЧКА. Ён у нас гэтакі, скажа.

ГАРБУЗ. А што, мая кароўка пісьменная, умее чытаць тыя надпісы, што паны на слупох панапісвалі?!

СУДДЗЯ. Зрабіце ўвагу пра скулу.

СТАРШЫНЯ. Упісаць словы. Далей.

ГАРБУЗ. «Кароўку маю аддайце!» — пачаў крычаць я. Не даюць. Аж тут падбег Авечка.

АВЕЧКА. Так точна, прыкульгаў я.

ГАРБУЗ. Бачыць аконам, што нас двое, карову за рогі, ды ў хлеў, а мы за хвост, ды назад, аконам рвець карову да сябе, мы да сябе. Бачыць карова, што дрэнная справа — адарвуць хвост, стукнула рагамі аконаму пад мікіткі, ды наўцёкі з двара: мы за ёй, аж тут паваліўся Авечка — лёг і я, і пачалі яны нас глушыць. Замітусілася ў маіх вачох, свет зрабіўся з хвігу, і я асунуўся.

АВЕЧКА. Так точна, абамлеў.

ЖОНКА. Тут падбегла я, загаласіла, заенчыла.

ПІСАР. І што было?

ГАРБУЗ. А яны сабе ўлажылі колькі хацелі і пайшлі.

АВЕЧКА. Так точна, пайшлі, закурыўшы смярдзячыя цыгары з добрага пацука.

СУДДЗЯ. Колькі разоў ён цябе ўдарыў?

ГАРБУЗ. А хто яго лічыў, — колькі хацеў.

АВЕЧКА. Я скажу, паўкапы ўшкварыў яму і гэтулькі даў мне.

СУДДЗЯ. А ты як злічыў?

АВЕЧКА. На вока браў. Я, пшэпрашаёнц, хоць няграматны, але на вока добра лічу. Я, глянуўшы на гурт, узгадаю, колькі там валоў, а глянуўшы на чалавека, узгадаю, колькі ён выпіў гарэлкі.

СТАРШЫНЯ. А ты хто?

АВЕЧКА. Я Лаўрэн Авечка, Гарбузоў сведка, жыву ў Негнавічах у старэнькай хатцы, што вокнамі ды ў пушчу ўглядаецца.

СТАРШЫНЯ. Кажы, што ведаеш, толькі не лжы.

АВЕЧКА. Няхай Бог крые, каб Авечкі лгалі, Авечкі на гэта не здатны. Наша радня ўсё шляхэтнай крыві. Авечкі стражнікамі былі, у канцыралі-

ях паперы пісалі. Адзін я, бядак, дзякуючы калецгву, змужычэў, седзячы ў вёсцы.

СУДДЗЯ. Скажы, ці слупы на панскіх межах былі расстаўлены?

АВЕЧКА. Ёсць, роўненька адзін у вадзін.

СУДДЗЯ. З надпісамі?

АВЕЧКА. Пэўна-ж.

СУДДЗЯ. Што там было напісана?

АВЕЧКА. А каршун яго ведае, няграматны я чалавек, прыду да слупа і гляджу, як гусь на бліскавіцу, а ні ў зуб. Але як чуў, казалі людзі, быццам там забаронена сячы лес, лавіць зайцоў, пушчаць сабак па ягады, а памыліўся, — дзяцей па ягады, і наогул, каб не ткнуць носу ў панскі бор.

СУДДЗЯ. Запішы пра слупы.

АВЕЧКА. Пішэце і пра слупы, і пра ягады, зайцоў. *(Забыўшыся, стукнуў палкай па стале).*

СТАРШЫНЯ *(адпіхнуўшы).* Цяпер пра драку пачынай.

АВЕЧКА. Так точна, цяпер пра драку. Было гэта перад святам. Дакульгаўшы з мястэчка да дому, я сеў за вячэру і, як цяпер памятаю, еў я зацірачку з малаком. І трэба-ж гэта, зацірка была такая гарачая, што хлапец нос апёк. Вось баба лье мне адну міску заціркі, я спаражніў; лье другую — спаражніў, і толькі, пшэпрашаёнц, за трэцюю ўзяўся... *(Гэта казаў да суддзі).*

СТАРШЫНЯ. Абжора нейкі.

АВЕЧКА. Гэта было не ўчора, а перад святам.

СТАРШЫНЯ. Я кажу, што ты абжора.

АВЕЧКА. А так, богу дзякаваць, з'есці магу, па дзеду пайшоў, дзед мой быў з духоўнікаў, еў не ў свой дух, памятаю, пакой вечны, на нач з'еў дзежку саладухі і Богу душу аддаў. Так баба лье мне трэцюю міску заціркі, спаражніў, аж чую, пшэпрашаёнц, дух заняло, і нібы цэпам малоціць, вылецеў гэта я на ганак і дыхаю, як баран у спякоту, вось гэтак *(дыхае)*, аж чую, нехта пішчыць. Я штырх у бок, бачу: цягне Гарбуз карову за хвост з панскага хлява, аж вочы на лоб лезуць;; здагадаўся я, у чым справа — за кол, ды туды. «Вы што-ж гэта, каб на вас гром!», гакнуў я... *(Спахваціўся).*

СТАРШЫНЯ. Запішы — гром.

ПІСАР. Запісаў.

АВЕЧКА. Тут падбегла Гарбузіха.

СТАРШЫНЯ. З чапялой?

АВЕЧКА *(хітра).* Здаецца, без чапялы.

СУДДЗЯ. Не можа здавацца, а кажы проста, — была чапяла, ці не было?

АВЕЧКА. Не, не было; чапяла ў яе вялікая, як аглобля — убачыў-бы. Так, значыць, падбег я і ўчарэпіўся за хвост кароўкі - перадойкі, аж вочы на лоб лезуць, і цягнем удвох. Бачыць кароўка, што дрэнная справа, адарвуць хвост, збіла з ног аконама, і наўцёкі. Мы за ёй, але заблуталіся мае качэргі — паваліўся, мягнуўся вобземлю і Гарбуз, а яны з нагамі — і давай акладаць.

ЖОНКА. Тут падбегла я, нарабіла крыку, дык яны пакінулі іх біць, закурылі цыгары — і пайшлі.

АВЕЧКА. Так точна, пайшлі, рагочучы, як лясуны перад маладзіком.

ПІСАР. А што ты ім услед казаў?

АВЕЧКА. А што я, Авечка, ды на паноў магу казаць, — глядзеў, пшэпрашаёнц, і маўчаў.

СУДДЗЯ. А як ты смеў насылаць на іх гром?

АВЕЧКА. Ды яны гэтага не чулі, я, бягучы, у духу забубнеў сабе, а рот заткнуўшы рукавом.

СУДДЗЯ. А ты часам не радня Гарбузу?

АВЕЧКА. Далёкая радня. Мой бацька з яго бацькам заўсёды разам у бані мыліся, кумамі былі.

СТАРШЫНЯ. А з ёй ты не радня?

АВЕЧКА. З замаладу меліся жаніцца, але як я закульгавіў, то яна за кульгавага не пайшла; тады я жаніўся з другой бабай, баба вельмі добрая, за-цірку варыць — ой, ой! толькі вельмі сярдзітая, з частых біцца кідаецца.

ПІСАР. Гэта да справы не адносіцца.

СТАРШЫНЯ. Дапрос зняты.

АВЕЧКА. Паночку, а ці можна ведаць, на колькі пасадзіце нашых ворагаў?

СТАРШЫНЯ. Пачакаўшы, будзеш ведаць.

З'ЯВА XII-я

(Убягае сторож Мірон.)

СТОРАЖ. Пан едзе, пан едзе...

СТАРШЫНЯ. Стой, не гарачыся, прыняць коні ў двор, адчыніць дзверы і быць на чаку. Хадзем. *(Пайшлі).*

ПІСАР. *(Пачаў збіраць паперы).*

СУДДЗЯ *(пры вакне).* Вось уязджаюць у двор на тройцы...

(Гарбуз і жонка да акна).
(Авечка п'е з вядра ваду ў другім кутку).

З'ЯВА XIII

(Уваходзіць Старшыня, а за ім упраўляючы ў цыліндры, паліто, галошах і з палачкай і папіроскай).

СТАРШЫНЯ. *(Адчыніўшы дзверы).* Міласці просім!

УПРАУЛЯЮЧЫ. *(Паважна ўвайшоўшы, кінуў папіроску).*

СТАРШЫНЯ *(Знімае паліто).*

ПІСАР *(цыліндар і бярэ кіёк)*

СУДДЗЯ. *(Кінуўся да ног знімаць галошы).*

СТАРШЫНЯ *(як усё знялі, адчыніўшы дзверы ў бакоўку).*

Міласці просім на пачэснае месца. *(Упраўляючы, Старшыня і Суддзя пайшлі).*

ПІСАР. *(Да Гарбузоў).* Ну, яшчэ чаго, дапрос зняты, паклічам, будзе пара. *(Усе выходзяць, Пісар з паперамі ідзе ў бакоўку).*

З'ЯВА XIV

(Уваходзіць сторож Мірон)

СТОРАЖ. Вось гэта я разумею, коні — нібы звяры, не раўня нашым пацукам, уляцелі ў двор стралой. Прыглядзеўся я на старшыню і памысліў: трывалы чалавек, не так даўно выпаўз адсюль ракам, а прышлося — вунь як пакіраваў, з вазка зняў, дзверы адчыніў і, здаецца, паспеў нешта зняць — гэта спрыт. Але на мяне крыўду мае, нашто разам з парсюком спаць паклаў. Нічагутка, я — таксама чалавек, адчуваю боль... Гэта што ты старшыня, так Мірона можна ганьбіць, другі раз

нап'ешся — на сметнік завалаку на чарэп'і. А што, каб гэта я адважыўся гэту світку з упраўляючага зняць — о не, няздатны, — зняў-бы так, што полы былі-б асобна, а рукавы асобна. *(Пауза)*. Крамная рэч, — ні вузелчыка, ні нітачкі, блішчыць, шалухціць *(нюхае)* і цыбулькай аддае. *(Убачыў капялюш)*. А капялюш, капялюш! Гэткага я з роду не бачыў, пан накрывае свой чэрап, а я ў ягады хадзіў-бы, вельмі прыгодны, чорны, цыбаты і тугі. *(Паплявай на яго, абцёр рукавом і палажыў на крэсла, на тое месца, дзе сядзе суддзя, справа ад публікі)*.

А гэтыя гумалясткавыя хадакі — таксама рэч паважная па гразі цяляпкацца. Божа, божа, як ты няроўна падзяліў, адным гэткую прыгоду, а другому — век зрэб'я.

ПІСАР *(з бакоўкі)*. Пакліч сюды Гарбузоў.

СТОРАЖ *(да дзвярэй)*. Гарбузы, кацецеся сюды!

З'ЯВА XV

(Уваходзяць Гарбуз і жонка).

СТОРАЖ. Ідзеце на суд, толькі не тупайце, як коні.

ЖОНКА.. Мы ўважненька. *(Пайшлі ў бакоўку)*.

З'ЯВА XVI

(Уваходзіць Авечка).

СТОРАЖ. Што, занудзіўся?

АВЕЧКА. А так, замаркоціўся: у сон пачало весці: ноч не спаў, на суд, значыцца, шкандыбалі. Ці не маеце часам закурыць, нешта тут пад грудзямі...

СТОРАЖ. Не маю, кожны курэц павінен мець свой аганец і тытунец.

АВЕЧКА. Так точна, павінен, ды няма. *(Убачыў на падлозе папяроску)*. А вось шчасце, нехта папяроску кінуў.

СТОРАЖ. Не нехта, а сам упраўляючы курыў.

АВЕЧКА. Галоднаму чалавеку ўсё роўна. *(Запальвае і курыць)*. А моцная, так за язык і шчыпле.

СТОРАЖ. Які далікатны.

АВЕЧКА. У Авечак языкі чулыя.

СТОРАЖ. Ды ты ўвесь, як авечка, і кульгавы, мне здаецца.

АВЕЧКА. Не здаецца, а кульгавы, вось глядзіце. *(Адыходзіць да таго месца, дзе ляжыць цыліндар)*.

СТОРАЖ. Даўно кульгаеш?

АВЕЧКА. Гадоў з дзесяць.

СТОРАЖ. З якой прычыны?

АВЕЧКА. Грошы шукалі, не паклаўшы.

СТОРАЖ. Ну і што?

АВЕЧКА. Прысніўся, было, маёй сястры сон, быццам то на Лысай гары бочка дукатаў закопана ляжыць. Вось мы ўночы, разам з Гарбузом, пабраўшы рыдлёвачкі, шчупы пайшлі туды. Курган высока на гары, а на ім камень, пудоў з 20, — мы яго капаць, мы яго пароць, каб камень той ды ў даліну сагнуць, капалі доўга, а цёмна, — хоць забіся. Нарэшце, чую, скрыганула нешта пад рыдлёўкай: я — зірк у бок: бачу — галава бялее чалавека *(У часе размовы сторож слухае, што робіцца ў бакоўцы і зусім не слухае, што кажа Авечка)*. Кум, крычу я, гэта-ж мы раскапалі чыюсь магілу.

Гарбуз, не кажучы ні слова, рыдлёўку аб зямлю, а сам — шабоўсь уніз, ліхтар патух, я за ім... тольκі чую, штось ляціць за мной: да-та-та-та, а пасля — бух... *(Сеў на цыліндар)*. Зваліўся камень, ды мне па назе.

СТОРАЖ *(убачыўшы, што Авечка сеў на цыліндар)*. Куды-ж ты гэта ўсеўся? (Схапіў за карак).

АВЕЧКА *(ад страху пачаў жагнацца)*. Міца, Міца, свяціцелі чудадзеі...

СТОРАЖ. Што ты зрабіў? Што табе — дух заняло?

АВЕЧКА. Браток мой, у чым мая віна, калека я, усю ноч валокся, хацелася сесці.

СТОРАЖ. Вось цяпер пасядзіш.

АВЕЧКА. Няўжо пасадзіць?

СТОРАЖ. Пашкадуе.

АВЕЧКА. Даражэнькі мой! а што, каб спрабаваць выраўнаваць?

СТОРАЖ. Раўнуй не раўнуй, капялюша няма, а табе вастрог.

АВЕЧКА. Тады я ўцяку; будзь ласкаў, не кажы: я жыву ў пушчы — не знойдуць.

СТОРАЖ. Нікуды ты не схаваешся, знойдуць.

АВЕЧКА. А чаму мой дзед у паўстанні два гады хаваўся, і не знайшлі, бывай здароў. *(Да дзвярэй)*.

ПІСАР *(праз дзверы і назад)*. Авечка, на суд!

СТОРАЖ. А што, схаваўся? А ну, пайшоў, пайшоў. *(Выпхнуў убок)*. Во каб яго пакруціла, скруціў капялюш, аж страх глянуць, ну, што-ж мне зрабіць? А што, каб узяць на дзяркач і таркануць туды - сюды. *(Бярэ венік і пачынае)*. А ну, сюды, а ну, сюды. А бацюхны, выраўнаваў, — вось шчасце, так шчасце. Цяпер абы ўпраўляючы вышаў, я спрытна надзену яму на галаву, не спазнае.

З'ЯВА XVII

(Выходзяць з бакоўкі Гарбуз і жонка)

ГАРБУЗ. Вось табе суд, вось табе і нуд, абабілі бакі, выдралі бараду, яшчэ ў адседку садзяць на тры дні.

СТОРАЖ. А хіба-ж я не казаў, — тут праўда жыве.

ЖОНКА. На сухі лес такі суд, чапялу пакінула ў хаце, а на судзе чапяла апынулася пры мне, сядзі баба тры дні ў халодніцы.

З'ЯВА XVIII

(Выходзіць Авечка)

АВЕЧКА. Гэта не суд, а, пшэпрашаёнц, глупства, я на паноў шапнуў «гром», і за гэта ў адседку на тры дні.

СТОРАЖ. Ну, годзе, суд ідзе... *(Сам за цыліндар)*.

З'ЯВА XIX

(Выходзіць з бакоўкі Старшыня, а за ім упраўляючы, Пісар і Суддзя).

СТАРШЫНЯ. Дзякую, што не запомнілі. *(Падае пальто)*.

СУДДЗЯ. *(Надзявае галошы)*.

СТОРАЖ. *(Падае цыліндар)*.

ПІСАР — (*кіёчак*).

СТАРШЫНЯ (*адчыніўшы дзверы*). Міласці прашу. (*Усе яны вышлі, асталіся Гарбуз, Авечка і сторож*).

СТОРАЖ. (*Пачынае вымятаць*). Ну, браткі мае, уцякайце, а то чаго добрага яшчэ падбавіць. (*Гарбуз і жонка ціха выходзяць*).

АВЕЧКА. Вось дзе праўда на свеце!...

ЗАСЛОНА

Cena 2,00 zł